## 14 жніўня 2022 г. – 75 гадоў з дня нараджэння УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА СУХАРАВА (1947), грамадскага дзеяча, ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна

**Уладзімір Іванавіч Сухараў** нарадзіўся 14 жніўня 1947 года ў Маскве.



Закончыў Маскоўскі юрыдычны інстытут. Прайшоў тэрміновую службу ў Савецкай арміі.

З 1971 па 1975 год працаваў у Чаромушкінскім райкаме камсамола г. Масквы. З 1975 па 1979 год - старшыня Чаромушкінскага раённага камітэта ДТСААФ г. Масквы.

Доўгі час Уладзімір Іванавіч узначальваў дырэкцыю Чаромушкінскага вытворча-жыллёвага рамонтнага аб'яднання г. Масквы. Шмат увагі надаваў пытанням працаўладкавання насельніцтва, кіраваў службай занятасці г. Масквы.

Уладзімір Сухараў - кіраўнік трох кампаній, заснавальнік шасці арганізацый, заснавальнік аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыі па садзейнічанні ў развіцці супрацоўніцтва з краінамі АНА «Усходняе вымярэнне».

У 1989 годзе заснаваў асацыяцыю дзелавога супрацоўніцтва з замежнымі краінамі «Інтэртрэйнінг».

З 1991 года У. І. Сухараў з'яўляецца сустаршынёй – выканаўчым дырэктарам Міжнароднага форуму «Сусветны вопыт і эканоміка Расіі», у рамках якога правёў больш за 100 буйнамаштабных усерасійскіх і міжнародных кангрэсаў, сімпозіумаў, канферэнцый у Маскве.

Праводзіў вялікую міжнародную дзейнасць, займаючыся пытаннямі пашырэння супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы з краінамі Блізкага Усходу і Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну. З'яўляўся віцэ-прэзідэнтам міжнароднага грамадскага руху «Восточное измерение», стварэнне якога асабіста падтрымаў прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін. Надаў шмат увагі пытанням дзейнасці Асамблеі дзелавых колаў «Расія-Ліван» на пасадзе генеральнага сакратара. З'яўляўся віцэ-прэзідэнтам англійскага Інстытута фінансавых аналітыкаў.

Уладзімір Іванавіч прымае актыўны ўдзел у навуковых пошуках, з'яўляючыся членам Міжнароднай Акадэміі

менеджменту, прафесарам Акадэміі інфармацыйных працэсаў і тэхналогій, членам Міжнароднай Акадэміі навук «Праблемы інтэлектуальнага развіцця», членам міжнароднай Акадэміі эканомікі і фінансаў.

Мае ганаровыя ўзнагароды Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўнай Думы і Савета Федэрацыі ФС РФ, урада Расійскай Федэрацыі.

Масквіча Уладзіміра Сухарава ў Кобрыне ведаюць многія, таму што ў нашым горадзе ён бываў не раз - і з дзелавымі візітамі, і на святах. З 1991 года ён актыўна ўдзельнічаў у жыцці Кобрына. Арганізоўваў і праводзіў сустрэчы па абмене вопытам і пашырэнні супрацоўніцтва для прадстаўнікоў бізнесу, прамысловасці, навукі і культуры Расіі і Беларусі. Аказваў дапамогу жыхарам і прадпрымальнікам Кобрыншчыны. Праводзіў вялікую работу па прыцягненні інвестыцый для эканамічнага развіцця рэгіёна, яго прадпрыемстваў і арганізацый. У 2005 годзе прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні Міжнароднага Інвестыцыйнага Форума «Кобрын-Інвест».

За вялікі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Кобрыншчыны, умацаванне дзелавых і сяброўскіх сувязяў двух братэрскіх народаў Беларусі і Расіі Уладзіміру Іванавічу Сухараву прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» (рашэнне Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта № 786 ад 18 жніўня 2005 г., рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 99 ад 18 жніўня 2005 г.).

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Долготович, Б. Д.** Сухарев Владимир Иванович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 33.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» Сухареву Владимиру Ивановичу : решение Кобринского районного исполнительного комитета, 18.08.2005 г., № 786 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 6. Д. 820. Л. 192.

**Сухараў Уладзімір Іванавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 47-48.

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах [Почётный гражданин Кобринского района. П. Г. Коренчук, В. И. Сухарев] / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 24 июня (№ 25). – С. 4.

**Неповторимый** колорит дружбы // Кобрынскі веснік. – 2007. – 25 ліпеня. – С. 1.

В августе 2005 г. за большой личный вклад в социально-экономическое развитие Кобринщины, укрепление связей двух братских народов Беларуси и России В. И. Сухарев удостоен звания «Почетный гражданин Кобринского района».

**Почётные** граждане Кобринского района // Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 жніўня.

О присвоении звание «Почётный гражданин Кобринского района» Коренчуку Павлу Григорьевичу, Сухареву Владимиру Ивановичу.

**Сухарев Владимир Иванович** // Список почетных граждан города Кобрина, Кобринского района / Отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 3-4.

Кобрын
Сухараў Уладзімір Іванавіч
Ганаровыя грамадзяне
Грамадскія дзеячы